# Памяці вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага

У бібліятэках, клубах і на прадпрыемствах Мінска пачалася падрыхтоўка да чацвертай гадавіны з дня смерці А. М. Горкага.

У бібліятэцы імені Горкага адкрыта выстаўка — «А. М. Горкі». Тут паказаны фотадакументы аб пісьменніку і яго лепшыя творы, спецыяльны альбом, дзе надрукавана пісьмо Горкага ад 10 кастрычніка 1932 года Беларускай акадэміі навук, у якім ён горача дзякуе за выбранне яго ў пачотныя акадэмікі, пераклад Горкім верша Я. Купалы — «А хто там ідзе», успаміны мінскага настаўніка А. В. Посаха — «Маё знаёмства з Алексеем Максімычам» і т. д.

***

У чытальнай зале Дзяржаўнай бібліятэкі імені Леніна (Мінск) адкрыта выстаўка, прысвечаная чацвертай гадавіне з дня смерці Алексея Максімавіча Горкага. Прадстаўленыя кнігі, фотаздымкі і артыкулы характарызуюць яркае жыццё геніяльнага пісьменніка, роданачальніка пролетарскай літаратуры А. М. Горкага. Тут яго кнігі «Дзяцінства», «Мае універсітэты», «Маці», «Фама Гардзееў» і рад апавяданняў. Ёсць фотаздымкі «Ленін і Горкі», «Сталін і Горкі», «А. М. Горкі». Пісьмы Уладзіміра Ільіча Леніна паказваюць выключную любоў вялікага правадыра народаў да пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага.

У вітрыне — кнігі І. Груздзэва: «Горкі і яго час», «Жыццё і прыгоды М. Горкага», артыкул акадэміка І. Лупала — «А. М. Горкі і сусветная літаратура», Б. Бяліка — «Сталін і Горкі», А. Волкава — «Горкі і сучаснікі» і рад іншых.